ВАЧЫМА МАЛАДЫХ

# ПАЛІНА ДВАРАНСКАЯ

## У пошуках шчасця




*Дараванне : аповесці / уклад і аўт. уступн. артыкула А. М. Карлюкевіч. — Мінск : Аверсэв, 2023. — 319 с. : іл. — (Сучасная беларуская літаратура).*

У гэтым годзе я стала пераможцай Рэспубліканскага літаратурнага конкурсу студэнтаў і школьнікаў «БрамаМар». На цырымоніі ўзнагароджання мне падарылі зборнік аповесцей «Дараванне», які выйшаў у серыі «Сучасная беларуская літаратура». На той момант я закрыла ўсе даўгі па вучобе, пачала будаваць планы на лета і выбіраць кнігі, якія хачу прачытаць. Ды вырашыла пачаць менавіта з «Даравання»...

У зборнік увайшло пяць аповесцей: «Дараванне» Алены Брава, «Геній» Алега Ждана, «Я цябе бачу» Анатоля Бензерука, «Нелюдзімы» Алеся Бадака і «Дзікі луг» Андрэя Федарэнкі. Кожны твор неверагодна ўзрушыў мяне, таму хачу падзяліцца сваімі ўражаннямі.

У аповесці «Дараванне» аўтар знаёміць нас з жанчынай-беларускай Ларысай, якая выйшла замуж за немца Ральфа Краўза. Цяпер яна жыве ў Германіі і даглядае бацьку мужа Ганса, хворага на Альцгеймер. На працягу твора раскрываюцца не толькі характары персанажаў, але і жудаснасць хваробы, якая праяўляецца прыпадкамі Ганса. Ён часта трызніць, яму здаецца, што цяпер вайна. Праз гэта жыццё Ларысы зрабілася пеклам, бо давялося «схаваць абрусы, пакрывалы, адмовіцца нават ад настольнай лямпы ў металічным корпусе». У рэшце рэшт Ларыса і Ральф вырашаюць аддаць Ганса ў Дом састарэлых. Жыццё сямейнай пары становіцца спакойным, аднак праз некаторы час жанчына знайшла асабісты дзённік старога і ў тую ж ноч... адправілася забіраць яго дахаты. «Дараванне» канчаецца сказам, ад якога вее цяплом і дабрынёй: «»Паедзем дамоў»,— скажа яна Гансу, скажа на сваёй мове».

У аповесці мне спадабаліся лірычныя адступленні: разважанні наконт войн, гісторыі ў цэлым, традыцый, нашых і нямецкіх, простыя філасофскія роздумы, кшталту «кожны з людзей самотны, нібыта рукавіца, згубленая ў снезе», «час ідзе, і нават самы страшны боль пакрываецца скарынкай забыцця».

Аповесць «Геній» Алега Ждана напісаная на рускай мове. Галоўны герой мастак Трыфан працуе на заводзе — малюе партрэты з фотаздымкаў. Ён даволі супярэчлівы, непастаянны, дзіўны, але сапраўдны геній. Аднак талент героя на працягу ўсяго твора аўтар ставіць пад пытаннем: «этот дар или несчастье, вывих, а может, и тайная болезнь».

З аднаго боку, мне шкада Трышку: яго каханне да Улі, якая працавала ў бліннай, не было ўзаемным. З іншага боку, немагчыма часам не асуджаць галоўнага героя, бо мастак неаднойчы крыўдзіў сваю маці і здзекаваўся з яе: «тогда он — впервые — и плюнул ей в лицо». Паводзіны Трышкі вельмі непрадказальныя. У сувязі з гэтым згадваецца цытата Ніла Гілевіча: «Паэт крыху вар'ят. Абавязкова». На маю думку, гэтыя словы можна аднесці як да мастака Трышкі, так і да любога творчага чалавека. У той жа момант аповесць узнімае цікавае пытанне: ці з'яўляюцца сапраўднымі геніямі тыя, каго мы звыклі імі лі-

чыць? Яшчэ запалі ў душу словы з аповесці: «Люди не выносят о себе правды, особенно если эта правда — для всех. Не терпят о себе чужого суждения».

Трэцяя аповесць «Я цябе бачу» Анатоля Бензерука складаецца з трох аповедаў: «Навошта зайцу тармазы?», «Малітва перапёлкі» і «Ванька-ўстанька». Форма падачы тэксту набліжаная да асабістага дзённіка. Я то смяялася, то плакала, то не на жарт задумвалася. Складана нават сказаць, пра што твор, мяркую, кожны пасля прачытання зробіць свае высновы.

У «Я цябе бачу» — безліч цікавых гісторый, успамінаў, згадак герояў, дзвюх жанчын і аднаго мужчыны. «Я па жыцці, насамрэч, калібры: крылцамі махаю часта-часта, каб не грымнуцца тварам у асфальт», «Час такі, абрэвіятурны, фастфудаўскі: хуценька паеў, пракаўтнуў неапетытную ежу, вадой запіў і — на лыжы. Пабеглі, вавёрачкі ў коле! Пабеглі!», «А сябе не шкада! Я яшчэ ўлезу ў вокны. Калі іх пазачыняюць — у комін залезу! На мятле палятаю. І вымету з сябе ўсё смецце — пустыя, кволыя, безнадзейныя надзеі. Вырву, як гэты зуб!!!», «Усе лічаць, уздыхаюць, эканомяць. На ежы, забавах, словах, людзях...», «Я ўжо хвалявалася. Моцна-моцна. З таго дня, як мы сустрэліся, я чакаю яго і хвалююся. Ведаю, што шчасце бывае трапяткім і кволым. Як вада і шкло. Як шклянка вады...», «Я лічу: кожны можа памыляцца, галоўнае, каб умеў небалюча выпраўляць свае памылкі...» Вельмі душэўна і шчыра...

Кранальны твор «Нелюдзімы» Алеся Бадака. Ужо з першых абзацаў я пазнаёмілася з героем — адзінокім дзедам Захарам, які «ведаў, што па ім ніхто тут не заплача. Проста не будзе каму». Нешчаслівым было і яго каханне: Верка ажанілася з Генікам. Цяпер яны памерлі і стары ўспамінае іх. Але ж Верка па факце і не любіла свайго мужа, а пайшла за яго толькі таму, што ў вайну галадала і разумела, што «шчасце не ў каханні, шчасце, калі не баішся лішні кавалачак хлеба адшчыпнуць, каб назаўтра было што з'есці».

Жыццё «нелюдзімага» змяняецца, калі ён даведваецца, што ў вёску прыехалі дачка і ўнучка Веры — ад размоў героя з Лідай і Светай на душы робіцца цяплей, бо герой кліча іх «дачушкай» і «ўнучкай»... Шмат эмоцый выклікаў у мяне эпізод, калі стары выратаваў унучку Свету ад незнаёмцаў у лесе. І вось гэтыя людзі — героі аповесці — нібыта сталі табе роднымі...

Насамрэч Захар вельмі мудры, у яго, бясспрэчна, ёсць чаму павучыцца, а многія яго словы я запомніла: «Думкі — самае непастаяннае, што ёсць у чалавеку, таму імі нельга асуджаць, як нельга і асуджаць за іх», «Чалавек да ўсяго прывыкае — нават да самага кепскага. Тады яму лягчэй і жыць, і выжываць», «Каб словы можна было забіраць назад, колькі людзей шчаслівейшымі жылі б».

Літаральна прымусіла мяне плакаць аповесць «Дзікі луг» Андрэя Федарэнкі. У першых дзвюх главах аўтар апісвае ўрочышча Дзікі луг - месца, дзе «начуюць у шалашах з сена, ядуць каля вогнішчаў, расказваюць розныя гісторыі...». У трэцяй главе зяўляецца Кулініч, якога прызначыў сваім намеснікам брыгадзір Маслоўскі. Потым аўтар знаёміць нас з жонкай Кулініча Махновачкай і іх малым сынам Васількам, а таксама малодшым братам Кулініча Пятром па мянушцы Кветка, дзедам Мікалаем Міронам, які ўсё жыццё працаваў на чыгунцы, і дзевятнаццацігадовым Грышам Ігнатавым, што «адсядзеў у турме за бойку год і паўтара месяца». Лёсы гэтых герой сплеценыя паміж сабой.

У канцы твора героі паміраюць. Смерць кожнага — вусцішная і нечаканая: спачатку Пятро Кветка (перад гэтым ён упаў на рэйкі тварам, з-за чаго застаўся без носа), а потым Васілька... выпадкова сеў у кіпень. Кулінічы спачатку трымаліся, а потым звар'яцелі. Словам, аповесць пакінула «салодкі і жахлівы боль у сэрцы».

Чытаючы зборнік «Дараванне», я нібыта пабывала сярод герояў усіх твораў. У кожнай аповесці ёсць свае адметнасці, разынкі, цікавосткі. І амаль увесь час вочы вільготныя... «Што ж гэта за такая штука жыццё, як жа ж яно ўмее падманваць, то ўзносячы чалавека высока, а затым непазбежна апускаючы ўсё ніжай, ніжай, ніжай?...»